Таким образом, с помощью системы упражнений и задач студенты более успешно осваивают понятийный аппарат курса начальной математики [5]. Упражнения и задачи успешно используются на этапе объяснения нового материала, его осмысления и усвоения, закрепления, а также на этапе контроля и рефлексии. Акцентирование внимания на этапах процесса решения задач детерминирует последовательность и преемственность овладения студентами математикой. Упражнения и задачи могут использоваться как средство управления процессом математической подготовки студентов.

ЛИТЕРАТУРА:

1. Истомина, Н.Б. Концепция обучения математике в начальной школе // Начальная школа. – 1996. – № 10. – С. 69–72.
2. Ананченко, К.О. Методика преподавания математики: учеб. пособие для студентов. – Минск: МГПИ им. А.М. Горького, 1991. – 89 с.
3. Саранцев, Г.И. Сборник упражнений по методике преподавания математики в средней школе: учеб. пособие для студентов. М.: Просвещение, 1983. – 80 с.
4. Балл, Г.А. Теория учебных задач: психологический аспект. / Г.И. Балл. – М.: Педагогика, 1990. – 184 с.
5. Пойа, Д. Математическое открытие / Д. Пойа. – М.Наука, 1976. – 448 с.

УДК 32.001

# З ВОПЫТУ ВЫКАРЫСТАННЯ ТЭСТАВАЙ ФОРМЫ КАНТРОЛЮ ВЕДАЎ ПРЫ ВЫКЛАДАННІ ПАЛІТАЛОГІІ

**Галубовіч В.У.**
УА “Гродзенскі дзяржаўны аграрны універсітэт”
г. Гродна, Рэспубліка Беларусь

Палітычная навука настала ўвайшла ў пералік дысцыплінаў, якія выкладаюцца ў вышэйшых навучальных установах нашай краіны напрацягу апошніх двух дзесяцігоддзяў. За гэты кароткі час яна стала неад’емнай часткай навучальнага працэсу, што ва ўмовах існавання такой палітычнай рэальнасці, як незележная краіна – Рэспубліка Беларусь, надае палітычнай навуцы своеасаблівую вагу і гарантуе важнае месца сярод гуманітарных навук. Айчынная палітыка з’ява нердынарная, а беларуская паліталогія, такая ж неадназначная, як і палітыка. Аднак, якая б яна ні была, ведаць яе трэба і, пажадана, добра. Галоўная ж праблема, на нашу думку, якая ўзнікае пры выкладанні палітычнай навукі, заключаецца не ў ёй самой, а ў агульнай палітычнай культуры беларускага народа, не звыклага за стагоддзі гісторыі да ўспрымання сябе ў палітычных катэгорыях як субьекта міжнародных адносінаў. Апалітычнасць і пасіўнасць – рысы амаль генетычна ўласцівыя далёка не адзінкам. Студэнцтва ў гэтым сэнсе мала чым адрозніваецца ад іншых сацыяльных груп, але ў адрозненні ад іншых паліталогію студэнты ўсё ж вымушаныя вывучаць. Адной з формаў актывізацыі ведаў і з’яўляецца тэсціраванне. На колькі эфектыўным трэба лічыць тэсціраванне пры вывучэнні гуманітарных навук –



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

пытанне дыскусійнае. Але не будзе сакрэтам, што тэст – вельмі зручная форма праверкі самастойнай падрыхтоўкі навучэнцаў, якая патрабуе напружання як з боку студэнта, так і выкладчыка. Ад апошняга залежыць і якасць тэставага задання, і яго рэгулярная абнаўляльнасць.

Якія патрабаванні неабходна выкарыстоўваць пры складанні тэставых заданняў? З нашага пункту гледжання тэст павінен адпавядаць патрабаванням навуковасці і комплекснасці. Складзены тэст павінен улічваць дасягненні сучаснай навуковай думкі, і асабліва зменлівасць палітычнага працэсу. Комплекснасць азначае, што тэст павінен ахапіць усе аспекты і дэфініцыі асобнай тэмы.

Пры складанні намі тэстаў па паліталогіі выявілася вельмі істотная праблема: якія падручнікі браць у якасці базавых? Далёка не ўсе тэмы аднолькава добра прадстаўляюцца ў кожным выданні, асабліва напісаныя калектывам аўтараў. Сярод падручнікаў, рэкамендаваных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь для ВНУ краіны, найбольш падыходзяць у якасці базавых для складання тэста падручнік па паліталогіі пад рэдакцыяй С.В.Рашэтнікава [1] і аўтарская версія “паліталогіі” У.А. Мельніка [2]. Аднак і гэтыя выданні не ва ўсім універсальныя. Увогуле ж арыентацыя толькі на некалькі крыніц непазбежна абмяжоўвае ўспрыманне палітыкі праз прызму прапанаванага аўтарам(і) бачання. Але ж на сённяшні дзень інтэрпрэтацый палітыкі столькі ж, колькі саміх выкладчыкаў паліталогіі.

Наш вопыт падказвае, што найбольш эфектыўнай з’яўляецца арганізацыя працы на практычных занятках з выкарыстаннем тэстаў па наступнай схеме. Група студэнтаў падзяляецца на падгруппы ў складзе 3-4 чалавекі. Усім выдаюцца тэставыя заданні аднолькавага зместу з пытаннямі (ад 15 да 30 у залежнасці ад складанасці тэмы). Напрацягу першай паловы занятка студэнты працуюць у сваіх падгрупах, а другая палова часу прызначаецца на самаправерку і абмеркаванне прапанаваных пытанняў, падчас чаго дадатковыя пытанні дазваляюць выявіць рэальны стан падрыхтаванасці да семінара. Аднолькавыя пытанні ў тэсце даюць магчымасць працаваць не з адной падгрупай, а з усімі адначасова. Пры гэтым нават працэдура праверкі можа быць арганізавана такім чынам, каб студэнты самі ў ёй ўдзельнічалі: здадзеныя вынікі тэсціравання трэба перадаваць на праверку не ў тую падгрупу, дзе выконваўся тэст, а ў іншую. Студэнты адной падгрупы атрымліваюць аднолькавыя адзнакі. Такая форма апытання, а правільней трэба сказаць, арганізацыі семінара, па-першае, гарантуе актывізацыю працы, паколькі не ўсе здольныя адэкватна пабудаваць адказ нават на падрыхтаваныя пытанні; па-другое, вымушае саўдзельнічаць у абмеркаванні варыянтаў адказаў самых пасіўных і незацікаўленых студэнтаў; па-трэцяе, праверка тэста на семінары дае магчымасць убачыць эфектыўнасць працы ў параўнанні з сваімі сваімі

калегамі. Нарэшце, самае апошняе, уся група атрымлівае адзнакі, чаго складана дамагчыся пры традыцыйнай апытальнай форме кантроля.

Праведзеныя ў некалькіх семестрах спробы выкарыстання вышэйпададзенай методыкі дазволілі зрабіць наступныя заўвагі. Такая форма практычных заняткаў сустракае заўсёды энтузіязм і спрыяе актыўнасці студэнтаў, але выяўляецца эфектыўнай толькі на першай трэці заняткаў. Досыць часта адмоўны вынік тэсціравання становіцца падставай для расчаравання студэнтаў у сваіх здольнасцях. Часам выказваюцца просьбы вярнуцца да класічных прыёмаў працы. Перанос цяжару самастойнай працы на семінар дае некаторым падставы не рыхтавацца да заняткаў, але тэст з'яўляецца вельмі небяспечнай пасткай для студэнтаў, паколькі толькі папярэдняя азнаямленне з тэмай гарантуе станоўчы вынік пры пошуках адказаў.

Падводзячы вынік прадстаўленым разважанням, адзначым, што тэставая форма кантролю ведаў студэнтаў істотным чынам узбагачае навучальны працэс, спрыяе актывізацыі самастойнай працы студэнтаў. Адначасова тэст не з'яўляецца адзінай і абсалютна эфектыўнай формай арганізацыі працы.

ЛІТАРАТУРА:

1. Политология: Учеб. для вузов / С.В. Решетников, Н.П. Денисюк, М.Ф. Чудаков и др.; Под ред. С.В. Решетникова.– Мн. ”ТетраСистемс”, 2001.– 448 с.

2. Мельник, В.А. Политология: Учебник / В.А. Мельник.– Мн.: Выш. шк., 2002.– 523 с.

УДК 378.147.091.3:5

## ПРОБЛЕМЫ ПРЕПОДАВАНИЯ КУРСА «КОНЦЕПЦИИ СОВРЕМЕННОГО ЕСТЕСТВОЗНАНИЯ»

**Исмаилова Г.Д.**
Кыргызская государственная юридическая академия
г. Бишкек, Кыргызстан

В современном «постиндустриальном» обществе в научные разработки и технологическую деятельность вовлечены миллионы люде. Работа их определяет судьбы миллиардов, поэтому без глубокого освоения идей, языка и методов современной науки невозможно разумно управляемого развитие человеческой цивилизации. Экологический кризис, поставивший человечество на грань катастрофы, вызван не научно-техническим прогрессом, а напротив недостаточным распространением в обществе научных и культурных знаний, породившим благодатную почву для принятия безответственных решений.

Глобальные проблемы, стоящие перед человечеством можно разрешить только при совместном решении их всеми народами, всеми государствами, используя все достижения наук. Принятие ответственных решений, необходимых для управляемого развития общества, невозможно без знания современной науки, ее языка и методов. Потому и требуется построение учебных курсов, интегрирующее идеи и методы



РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ